ПАД МІРНЫМ НЕБАМ БЕЛАРУСІ

# ПАМЯТАЦЬ, КАБ ЖЫЦЬ

**18 красавіка ў Дзяржаўнай установе адукацыі «Ліцэй № 1 імя акадэміка Ю. М. Астроўскага г. Гродна» адбылася грамадска-літаратурная акцыя «Пад мірным небам Беларусі». Традыцыйны праект Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі сёлета прымеркаваны да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.**

**ДЛЯ ДАВЕДКІ.** Грамадска-літаратурная акцыя «Пад мірным небам Беларусі» была ініцыяваная Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі ў 2015 годзе. Яна праходзіць у форме творчых сустрэч, вечароў паэзіі, публічных літаратурных мерапрыемстваў ваенна-патрыятычнай і грамадзянскай тэматыкі ва ўстановах адукацыі і культуры г. Гродна і Гродзенскай вобласці. Мэты акцыі – з дапамогай мастацкага слова аддаць даніну памяці і пашаны ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, савецкаму народу-пераможцу фашызму, выказаць удзячнасць за магчымасць сёння жыць пад мірным небам; прыцягнуць увагу прадстаўнікоў розных пакаленняў да недапушчальнасці паўтарэння жахаў вайны.



Гэта фактычна ўрок мужнасці, дзе ў ролі настаўнікаў выступаюць гродзенскія літаратары. У красавіцкім мерапрыемстве перад навучэнцамі гродзенскага першага ліцэя выступілі: «дзіця вайны», ветэран узброеных сіл, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Браніслаў Ермашкевіч; член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Людміла Шаўчэнка і член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык (вядучы). Моладзь даведалася пра літаратурнае жыццё Прынёманскага краю; пра дзейнасць Саюза пісьменнікаў Беларусі і Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ. Увазе аўдыторыі былі прадстаўлены некалькі кніг: «Победили! Перамаглі!» (Санкт-Пецярбург, 2024) і «Памяти вечный огонь» (Гродна, 2024). Прагучала запрашэнне на Інтэрнэт-сайт СПБ-Гродна. Што тычыцца супрацоўніцтва пісьменніцкай арганізацыі вобласці з дзяржаўнай установай адукацыі, яно даволі актыўна развіваецца. Дзякуючы бібліятэкару ліцэя Іне Уладзіміраўне Балуевай гэта ўжо не першае мерапрыемства з удзелам запрошаных членаў СПБ. У ходзе акцыі прагучалі паэтычныя і публіцыстычныя творы ў рэчышчы заяўленай

тэматыкі, адказы на пытанні. Аўтары падарылі свае кнігі ліцэю, правялі аўтограф- і фотасэсіі, атрымалі падарункі ад удзячных гаспадароў. Прымеркаваная да 80-годдзя Перамогі грамадска-літаратурная акцыя «Пад мірным небам Беларусі» працягваецца.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** грамадска-літаратурная акцыя «Пад мірным небам Беларусі» ў Дзяржаўнай установе адукацыі «Ліцэй № 1 імя акадэміка Ю. М. Астроўскага г. Гродна». 18 красавіка 2025 года.




















Бібліятэка ліцэя атрымала адзін з нумароў літаратурнага альманаха «На Нёманскай хвалі», а таксама персанальныя аўтарскія выданні

















